# ЗАКРЫТЫХ ТЭМ НЯМА

## У Савеце Рэспублікі прайшла сустрэча з актыўнай і ініцыятыўнай моладдзю — студэнтамі розных курсаў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Трэба сказаць, што такія стасункі ў фармаце жывога і адкрытага дыялогу сталі свайго роду традыцыйнымі ў сценах верхняй палаты Парламента. Гэтыя сустрэчы дазваляюць моладзі даведацца аб сутнасці дзейнасці сенатараў, структуры беларускага парламента і актуальных пытаннях з жыцця грамадства, якія трансфармуюцца ў заканадаўчыя акты.**



Фота БелТА.

Сустрэчу ініцыявалі самі студэнты, якія з гонарам адзначалі, што іх рэктар — Алег Раманаў — таксама з'яўляецца членам Савета Рэспублікі. Для маладых людзей правялі пазнавальную экскурсію, падчас якой яны дазналіся аб тым, як дзейнічае заканадаўчы механізм, над чым зараз працуюць заканатворцы і як функцыянуе палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва.

Асабліва цёплай сустрэча выдалася і таму, што студэнты прыехалі з роднага горада старшыні Савета Рэспублікі, дзе яна нарадзілася, вырасла і правяла большую частку свайго жыцця. Спікер верхняй палаты Парламента шчыра павітала сваіх землякоў і прыгадала той перыяд, калі яна была студэнткай гэтай навучальнай установы (на той час політэхнічнага інстытута). Наталля Качанава падкрэсліла: закрытых тэм няма, маўляў, пытацца можна аб усім, што цікавіць, — адкажа ўсім і на любую тэму.

Аліна Паненка задала пытанне наконт статусу маладога спецыяліста і размеркавання выпускніка пазабюджэтнай формы адукацыі. Дзяўчына падкрэсліла, маўляў, вучымся аднолькава, грамадскай дзейнасцю займаемся, але, калі размяркоўваецца бюджэтнік, ён атрымлівае пэўныя льготы: кампенсацыю па найме жылля, штомесячныя даплаты і гэтак далей. А такі ж выпускнік-платнік, які знайшоў сабе першае месца працы, гэтых прэферэнцый не атрымлівае.

Наталля Качанава пагадзілася, што пытанне зараз актуальнае: размеркаванне выпускнікоў павінна заставацца ў тым ліку для платнікаў, якія жадаюць працаўладкавацца. Яна расказала, што днямі гэтае пытанне ўзнімалася на найвышэйшым узроўні і разглядаецца змена суадносінаў набору з памяншэннем набору на пазабюджэтную форму навучання ў бок павелічэння колькасці бюджэтнікаў і студэнтаў з мэтавым накіраваннем. Гаворка аб тым, каб абітурыенты не толькі з невялікіх гарадоў (дзе колькасць насельніцтва не перавышае 20 тысяч чалавек), але і большых гарадоў мелі магчымасць атрымаць мэтавае накіраванне і трапіць на бюджэтнае месца. Наталля Качанава падкрэсліла: прапорцыя будзе змяняцца нейкі час. І гэтае актуальнае пытанне неабходна прапрацаваць у самы бліжэйшы з зацікаўленымі міністэрствамі — адукацыі і фінансаў.

Тэму адукацыі працягнуў адзін са студэнтаў юрыдычнага факультэта, які пацікавіўся лёсам змен у Кодэкс аб адукацыі і ў прыватнасці наданні заканадаўчага статусу такой форме навучання, як дыстанцыйнае. Існуе вялікая катэгорыя людзей, якія маюць патрэбу ў атрыманні адукацыі на аддаленні.

Наталля Качанава цалкам пагадзілася з неабходнасцю ўнясення змен, якія прадыктаваны самім жыццём. Дакумент ужо прыняты ў першым чытанні ў Палаце прадстаўнікоў. Спікер верхняй палаты Парламента падкрэсліла важнасць унясення гэтай навацыі ў заканадаўчыя акты.

Яўген Моніч, таксама студэнт юрыдычнага факультэта, пацікавіўся перспектывамі новага інстытута, які з'явіўся ў крымінальным працэсе — медыяцыі (днямі сенатары ўхвалілі змены ў Крымінальны кодэкс. — **Заўв. аўт.**) Хлопец выказаў сумнеў, што ў крымінальным працэсе гэта не самы дзейсны механізм.

Спікер верхняй палаты Парламента адзначыла, што інстытут медыяцыі — не новае ў заканадаўстве, у грамадзянскім праве ўжо эфектыўна дзейнічае. Як прыжывецца ў крымінальным працэсе гэтая навацыя, пакажа час, перакананa спікер верхняй палаты Парламента.

У той жа час Наталля Качанава звярнула ўвагу, што юрыдычна падкаваным неабходна быць не толькі спецыялістам у гэтай галіне, але і ўсім прадстаўнікам грамадства, каб разумець, да чаго могуць прыводзіць розныя дзеянні, якія не стасуюцца з дзеючым заканадаўствам.

Падчас адкрытай гутаркі студэнцкі актыў задаваў таксама пытанні адносна стасункаў удзельнікаў Саюзнай дзяржавы і перспектыў гэтага палітычнага саюза, пераразмеркавання сродкаў дарожнага збору паміж рэгіёнамі, неабходнасцю стварэння адмысловага заканадаўства аб хатнім гвалце, аплаце студэнцкага інтэрната, ільгот на праезд для студэнцкай моладзі і гэтак далей.

Па многіх пытаннях, якія прагучалі падчас двухгадзіннай сустрэчы з моладдзю, Наталля Качанава падкрэсліла: актуальныя і злабадзённыя, некаторыя з іх патрабуюць большай прапрацоўкі на заканадаўчым узроўні. Адпаведныя даручэнні будуць дадзены профільным міністэрствам і пастаянным камісіям Савета Рэспублікі для больш грунтоўнага вывучэння.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**